# 23 лютага — Дзень Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту

## ВУЧЭБНЫ БОЙ...



Ваенная кафедра БДУ імя У. І. Леніна рыхтуе афіцэраў, па ўзроўню тэарэтычнай падрыхтоўкі не ўступаючых выпускнікам ваенных вучылішчаў. І няхай не ўсе ў далейшым прысвяцяць сябе ратнай службе, навыкі, якія набылі тут, патрэбны нам для абароны Радзімы.

Кафедра ваеннай падрыхтоўкі пры нашым універсітэце — адна з лепшых у сістэме падобных навучальных устаноў.

Начальнік кафедры палкоўнік Барыс Міхайлавіч Глазкоў расказвае:

— Да нас паступаюць станоўчыя водгукі з месц, дзе праходзяць службу нашы выпускнікі, пажадаўшыя служыць у радах Савецкай Арміі. Пісьмы з падзякамі пішуць і самі афіцэры — выхаванцы кафедры.

У ліку нашых выкладчыкаў — удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны. Увесь выкладчыцкі састаў мае немалы вопыт службы ў войсках. Ведамі, атрыманымі ў акадэміях, на палігонах і ў часцях нашы афіцэры шчодра дзеляцца са студэнтамі.

...Вучэбны бой. Але здавалася, што воіны дзейнічаюць у агні і дыме баявых абставін, настолькі імклівымі былі пераадоленне «міннага» поля і дзеянні ў «заражанай» мясцовасці.

...Наперадзе — пазіцыі «праціўніка». Салдаты ўзвода, якім камандуе Л Ракавец, меткім аўтаматна-кулямётным агнём паражаюць мішэні. Другую лінію абароны яны закідваюць гранатамі. Умела манеўруючы, замацоўваюцца на апорным пункце «непрыяцеля». Узвод паспяхова выканаў задуму камандзіра. «Праціўнік» разбіт.

Акуратны строй узвода, аўтаматы, улітыя ў плечы.

Падпалкоўнік Р. Пека адзначае рашучасць і ініцыятыву М. Антаноўскага, В. Харошкі, М. Журавовіча.

**А. БАСАЎ,**
**А. КАЗАК.**
Фота аўтараў.





## «Служу Савецкаму Саюзу!»



**Ва універсітэце прайшоў урачысты сход, прысвечаны ўручэнню выкладчыкам і супрацоўнікам БДУ медалёў «Ветэран Узброеных Сіл СССР». (Медаль уведзен Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 20 мая 1976 г.).**

**На сходзе выступіў мінскі абласны ваенны камісар Канстанцін Сямёнавіч Раманчанка. Ён адзначыў:**

**— Медаль «Ветэран Узброеных Сіл СССР» даецца за беззаганную шматгадовую службу тэрмінам дваццаць пяць і больш гадоў ва Узброеных Сілах СССР. Гэты медаль — тым, хто аддаў шмат сіл і намаганняў, сваё ўменне, талент на карысць Айчыне. Дазвольце ад імя Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР уручыць 84 выкладчыкам і супрацоўнікам вашай установы — былым ваеннаслужачым — медаль «Ветэран Узброеных Сіл СССР».**

**Уручэнне ўзнагарод прайшло ў хвалюючай атмасферы. Ад імя ўзнагароджаных на сходзе выступіў старшы лабарант кафедры функцыянальнага аналізу мехмата, старшыня савета ветэранаў БДУ А. С. Мізрахі. Ён выказаў удзячнасць партыі і ураду за тое, што іх, ветэранаў Узброеных Сіл, ведаюць і памятаюць.**

**— Атрымліваючы з рук ваенкома ўзнагароду, — закончыў сваё выступленне Аляксандр Саламонавіч, — я думаю, кожны з прысутнічаючых у гэтай зале сказаў бы: «Служу Савецкаму Саюзу!».**

Фота С. Шыдлоўскай.

# ІДЗЕ ЎСЕСАЮЗНЫ КАМСАМОЛЬСКІ

## ЗА СЛОВАМ — СПРАВА

— Для ўнясення сцяга, прашу ўсіх устаць, — гучыць голас сакратара камітэта камсамола Веры Прокашавай.

Над радамі камсамольцаў механіка-матэматычнага факультэта, якія сабраліся ў актавай зале універсітэта на Усесаюзны камсамольскі сход з парадкам дня «Камуністычную ідэйнасць, актыўную жыццёвую пазіцыю — кожнаму камсамольцу», пранёс сцяг камсамольскай арганізацыі універсітэта адзін з лепшых студэнтаў мехмата Уладзімір Сувораў.

У прэзідыуме прадстаўнікі дэканата і грамадскіх арганізацый факультэта і універсітэта, камсамольскія актывісты; з запрошаных — галоўны інжынер рэспубліканскага штаба студэнцкіх будаўнічых атрадаў І. Ман.

Аб тым, што хвалюе камсамольцаў-матэматыкаў сёння, аб чым пойдзе гаворка на сходзе, — сведчыць афармленне залы — плакаты: «Рашэнні XXV з'езда КПСС — ажыццёвім!», «Ніводнага адстаючага побач!», «Кожнай камсамольскай групе — падшэфны клас», «Дастойна сустрэнем 60-годдзе Вялікага Кастрычніка!».

Усе гэтыя пытанні закранае ў сваім выступленні Вера Прокашава. Прынцыпова падыходзіць сакратар камітэта камсамола да пытання аб эфектыўнасці сацыялістычнага спаборніцтва на факультэце, выкрывае недахопы ў арганізацыі студэнцкага навуковага таварыства, гаворыць аб рабоце камітэта камсамола па маральна-эстэтычнаму выхаванню студэнтаў, аб шэфскіх сувязях, аб фарміраванні СБА мехмата. Мэта яе выступлення — яшчэ раз указаць на недахопы ў рабоце камітэта камсамола і разам з усімі камсамольцамі факультэта абмеркаваць меры іх ліквідавання.

У спрэчках выступілі С. Атаманава, студэнтка III курса, грамадскі куратар I курса; Г. Язёнак, студэнтка II курса, член шэфскага сектара; А. Азараў, сакратар камітэта камсамола супрацоўнікаў; В. Берзіна, студэнтка IV курса, адказная за работу агітбрыгады; А. Казулін, студэнт II курса, намеснік сакратара камітэта камсамола па ідэалагічнай рабоце; І. Васільеў, студэнт V курса, член камітэта камсамола.

У заключэнне сходу сакратар партыйнага бюро факультэта Р. Вальвачоў канкрэтызаваў задачы, якія стаяць перад камсамольцамі мехмата ў сувязі з падрыхтоўкай да 60-годдзя Вялікага Кастрычніка.

Сход аднадушна прыняў пастанову і план мерапрыемстваў па дастойнай сустрэчы юбілею Савецкай улады.

**Т. САХАШЧЫК.**

## З ДЗЕЛАВЫМ ПАДЫХОДАМ

Прайшло чарговае пасяджэнне бюро камітэта камсамола універсітэта. Першаступеннай важнасці пытаннем стала абмеркаванне правядзення ў нашай установе Усесаюзнага камсамольскага сходу «Камуністычную ідэйнасць, актыўную жыццёвую пазіцыю — кожнаму камсамольцу!». Падкрэслена, што трыбуна гэтага сходу павінна выкарыстоўвацца для творчага, дзелавога абмеркавання праграмы дзеянняў кожнай камсамольскай арганізацыі.

Неабходнасць дакладна і патрабавальна прааналізаваць поспехі і недахопы ў дзейнасці камсамольскіх груп прадыктавала другое пытанне пасяджэння: аб рабоце факультэцкіх камітэтаў камсамола па выкананню пастаноў вышэйстаячых камсамольскіх органаў. На сённяшні дзень у камсамольскіх арганізацыях БДУ прайшлі шматлікія сходы, гутаркі, на парадку дня якіх стаяла вывучэнне матэрыялаў кастрычніцкага (1976 г.) Пленума ЦК КПСС, VI пленума ЦК ВЛКСМ. У групах працягваецца спаборніцтва «Ніводнага адстаючага побач!». На біялагічным і механіка-матэматычным факультэтах распрацаваны мерапрыемствы па паляпшэнню работы камсамольскіх арганізацый супрацоўнікаў. На гістарычным, біялагічным, філалагічным, радыёфізічным і механіка-матэматычным факультэтах ёсць стэнды «Па тваіх прапановах, камсамолец, зроблена». Праводзіцца пэўная работа ў тых напрамках грамадскай дзейнасці, якія зацверджаны ў якасці ўдарных.

Але ў працы членаў камітэтаў камсамола факультэтаў па выкананню рашэнняў вышэйстаячых камсамольскіх органаў шмат сур'ёзных недахопаў, недакладнасцей. У шэрагу камітэтаў камсамола (ФПМ, юрфак) у дрэнным стане дакументацыя. Многія факультэцкія арганізацыі ўдзяляюць вельмі мала ўвагі сваім ударным справам. У камсамольцаў ФПМ, юрыдычнага, геаграфічнага, філалагічнага факультэтаў слабая наглядная агітацыя па спаборніцтву «Ніводнага адстаючага побач!». У камітэце камсамола філфака зусім не прапагандуюцца пераможцы спаборніцтва за права падпісаць Рапарт Ленінскага камсамола ЦК КПСС да 60-годдзя Кастрычніка. Адзначаліся многія іншыя недахопы ў дзейнасці факультэцкіх камсамольскіх арганізацый.

Абмеркаванне гэтага пытання вылілася ў жывую размову паміж членамі бюро і запрошанымі на пасяджэнне сакратарамі камітэтаў камсамола факультэтаў БДУ. У выніку бюро пастанавіла абавязаць падначаленыя камітэты распрацаваць да 1 сакавіка план мерапрыемстваў па ліквідацыі адзначаных недахопаў і выкананню пастановы IV пленума камітэта камсамола БДУ.

Трэцяе пытанне пасяджэння — ацэнка дзеяння зімовых СБА. Такіх атрадаў у час канікул па рэспубліцы было створана чатыры—два ў Брэсце і два ў нашай установе. Універсітэцкія атрады — імя 60-годдзя Вялікага Кастрычніка і імя акадэміка Курчатава — за 12 дзён працы асвоілі 39 тысяч рублёў капіталаўкладанняў, правялі вялікую грамадска-палітычную работу. Але галоўнае — атрады з'явіліся добрай школай для будучых камандзіраў і камісараў летніх СБА. Настрой быў азмрочан толькі фактам дрэннага падрыхтоўчага перыяду зімовых атрадаў.

Але ў цэлым работа СБА адобрана, бюро зацвердзіла прапанову аб узнагароджанні іх байцоў і кіраўнікоў. Прысутныя заслухалі інфармацыю аб фарміраванні летніх будаўнічых атрадаў.

І, нарэшце, апошняе — ва універсітэце арганізаван аператыўны атрад. Бюро разгледзела прапанаваны камандзірам оператрада — студэнтам юрфака У. Наваковым — план яго работы — назіранне за паводзінамі студэнтаў у інтэрнатах. Мяркуецца, што оператрад будзе выконваць, акрамя кантралюючай, выхаваўчую функцыю.

У заключэнне пасяджэння члены бюро выказалі думку, што камсамолія універсітэта ўлічыць усе заўвагі і прапановы, новымі поспехамі ў вучобе, грамадскай дзейнасці сустрэне слаўны юбілей нашай сацыялістычнай Айчыны.

**С. МІКАЛАЕВА.**

# Ружовы ранак

Літаратурная старонка

### У. МАЗГО

* * *

Для равеснікаў
Вайна—
Кніжная старонка.
У акопах цішыня
Расцвіла рамонкамі.
І чаму, май-чарадзей,
Ные, як ад ранаў,
Вострым болем
Кожны дзень
Сэрца ветэрана?..
Сувязістам
Праз гады
Памяць працягнула
Успаміны-правады
Сувязі з мінулым...

### О. ВЕЛИКСОНОВ

**ПОГРАНИЧНОЕ БЕСПОКОЙСТВО**

Я сплю, и мне ночами снится
Всегда тревожная граница.
Молчат леса, молчат отроги
И даже камень-сердолик,
И ощущение тревоги
Не покидает ни на миг.
Играют отблески зарницы
И полосуют неба высь,
В душе тревога и граница
В одно понятие слились.
Не покидает это свойство
Меня среди счастливых дней,
Моё святое беспокойство
О судьбах Родины моей.

### А. ЦВЯХ

* * *

Вайна грымела дзесьці
у аддаленні,
А тут павольна дагарау заход.
Стралялі ў печы мёрзлыя
паленні,
Ваконца хатняе пакрыў
барвовы лёд...

Бабуля сівая не можа ўсё
сагрэцца...
Яна глядзіць, дзе — супраць
абразоў—
Ужо каторы год, хвалюючы ёй
сэрца,
Вісяць тры здымкі трох яе
сыноў.

Яна слязінкі выцірае хусткай,
І цень у сполахах агню,
як быццам кроў...
І чуцен шэпт: «Матуля!
Будзем хутка
Мы ў родным доме будзем
разам зноў!»...
Не плач, матуля... Прыйдзе
перамога,
І мы жывыя вернемся
з вайны!..»
. . . . . . . . . . . . .
...За сотні вёрстаў ад сяла
глухога
Ішлі ў апошні бой яе сыны.

### Т. ПОЛЕТАЕВА

* * *

«Жить — это как, а?», —
Девочка спрашивала.
«Течь», — сказала река,
Угол скашивая.

Ласково шебеля
Волосы кукурузные, —
«Растить», — сказала земля,
Большая и грузная.

И под всеобщий смех
На заросшей тропиночке, —
«Может, тянуться вверх?», —
Покраснела былиночка.

«Разгонять облака!», —
Засвистел ветер,
Улетел ветер.
Жить — это как, а?

Дзень добры, паважаная рэдакцыя!

Толькі што закончылася мая апошняя сесія ў БДУ. Але наперадзе яшчэ дыпломная і дзяржэкзамен. Займаюся на шостым курсе завочнага факультэта (аддзяленне беларускай і рускай мовы і літаратуры), працую выкладчыкам роднай мовы і літаратуры ў Бярэзінскім раёне. У вольны час пішу вершы. Адзін з іх нарадзіўся пасля заняткаў па семінару «Творчасць Я. Коласа». Вяла ў нас гэты семінар вопытны педагог, чалавек прыгожага ўнутранага свету Вольга Васільеўна Казлова.

Дасылаю, паважаная рэдакцыя, гэты верш з надзеяй, што ён паявіцца на старонках «Беларускага універсітэта».

З прывітаннем **М. Пазнякоў.**

## *Якубу Коласу*

*«Вашы творы служаць для нас вялікай і вострай зброяй». (З пісьма партызана М. Шмырова Якубу Коласу).*

Я кланяюся мужнасці тваёй,
Радзімы сын, пясняр народны,
Нязгаснай зоркай ззяе над
зямлёй
Сягоння подзвіг твой
высакародны.
На заклік твой падняліся браты
І ворагу спакою не давалі;
Узляталі склады, цягнікі, масты,
Для катаў куляй словы тваე
сталі.
Твой верш гучаў — не суцяшаў
у жальбе, —
А веру нёс байцам у перамогу,
Ён сілу нёс народу ў барацьбе,
Ён у баі быў дзейснаю
падмогай.
Ты знаў: змаганне — гэта
перш за ўсё,
І гнеўна клікаў, клікаў
да расплаты
На фронце, ў тыле сілай сваіх
слоў
Ты набліжаў вясновы сорак
пяты...

# ЦУДОЎНЫЯ ІМГНЕННІ ТАНЦА

Не так даўно адбылося адкрыццё клуба любіцеляў тэатра універсітэта.

...Святочны вечар. У зале — студэнты і супрацоўнікі БДУ. На сцэне — артысты Дзяржаўнага ордэна Леніна акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета. Сваё ўступнае слова сказалі сакратар камітэта камсамола універсітэта А. Тозік і намеснік дырэктара тэатра А. Калеснічэнка.

І вось — спектакль. Гучыць уверцюра. Уся зала з гэтай хвіліны з Жызель. Яе партыю танцуе лаўрэат міжнароднага конкурсу Таццяна Яршова. Цудоўная, лёгкая, пластычная, расказвае яна пра няпростую душу Жызель. Актрыса валодае бясспрэчным драматычным дарам. Парадавалі і іншыя выканаўцы — Мартынаў (Альберт) і Бацвіннік (Ганс).

У антракце адбылася сустрэча з вядучымі акцёрамі тэатра: Людмілай Сінельнікавай, Уладзімірам Камковым, Сяргеем Бясцехіным.

Вечар закончыўся. Доўгія апладысменты, кветкі, бляск пражэктараў, сустрэчы сяброў — хай паўторыцца гэта яшчэ і яшчэ раз!

**В. ЛАДУЦЬКО.**

# ЗАПРАШАЕМ НА КАНЦЭРТ

Невычарпальная крыніца народных талентаў. Вялікая цікавасць у рэспубліцы да аднаго з вядучых калектываў мастацтва — Дзяржаўнага ансамбля танца БССР.

Ад Дняпра да Буга, ад Заходняй Дзвіны да Прыпяці па крупінках збіралі фалькларысты-харэографы тое, што створана беларускай народнай творчасцю ў танцы. Ансамбль беражліва захоўвае і перадае лепшыя рысы і традыцыі беларускага народнага фальклору, узбагачае іх у сваіх работах, застаючыся верным духу і характару сапраўды народнага многанацыянальнага мастацтва.

Сённяшняя праграма — «Вянок беларускіх танцаў»: імклівая «Лявоніха», іскрысты «Крыжачок», заўзятая «Полька-Янка»... і побач — «Лянок», які адлюстроўвае старажытную на беларускай зямлі працу льнаводаў. Жартаўлівыя мужчынскія танцы «Козыры», «Лявоны» і жаночы карагод «Перапёлачка». Арыгінальнасць кампазіцыі, арганічнае спалучэнне іграных, пантамімных прыёмаў з народнымі танцавальнымі элементамі яскрава праяўляюцца ў харэаграфічнай карціне «На купалле», якая пастаўлена па матывах беларускага народнага абраду, у жартаўлівай мініяцюры «Паўлінка», створанай па матывах вядомага твора народнага паэта Беларусі Янкі Купалы.

У рэпертуары ансамбля рускія, украінскія, малдаўскія, польскія, чэшскія, венгерскія румынскія танцы. Калектывам створаны новыя харэаграфічныя творы, адлюстроўваючыя характар сучаснай моладзі.

Студэнты універсітэта запрашаюцца на канцэрт Дзяржаўнага ансамбля танца БССР. Канцэрт адбудзецца 2 сакавіка ў Акруговым Доме афіцэраў. Білеты на канцэрт можна набыць у камітэтах камсамола факультэтаў.

## ПАВЕДАМЛЯЕМ:

12—13 мая 1977 года ў БДУ імя У. І. Леніна будзе праходзіць II канферэнцыя маладых вучоных універсітэта на тэму «Сучасныя праблемы аховы навакольнага асяроддзя».

Належыць абмеркаваць наступныя пытанні:

1. Праблемы аховы паветра, вады, глебы ва ўмовах узмоцненага антрапагеннага ўздзеяння.

2. Сучасныя метады вывучэння ступені ўздзеяння тэхнагеннага фактару на навакольнае асяроддзе.

Заявы на ўдзел неабходна падаваць старшыням саветаў маладых вучоных факультэтаў не пазней 25 ЛЮТАГА 1977 ГОДА. У заяве неабходна ўказаць наступнае: прозвішча, імя, імя па бацьку, займаемую пасаду, спецыяльнасць і назву даклада.

**САВЕТ МАЛАДЫХ ВУЧОНЫХ БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.**

# БЫЛІ КАНІКУЛЫ...

# ЛЕНІНГРАДСКІЯ ЭЦЮДЫ



Нява не адлюстроўвала нічога. Была адліга. Неўскія воды нетаропка, з затоенымі да пары нядобрымі страсцямі, плылі да заліва. Снег падаў між ільдзін, як у бяздонныя калодзежы.

Экскурсавод памаўчала, памацала чамусьці набярэжную, падала:

— Масква белакаменная, а Ленінград гранітны. Граніт да твару шэрым суровым водам Нявы...

Мы былі ў сэрцы горада.

У той яго частцы, што называюць музеем пад адкрытым небам. Дзе душа ў хваляванні ад адных толькі назваў вуліц і каналаў. А кожны каменны



пялёстак пабудоў перапоўнен гонарам за сваю гістарычную асобу.

На Дварцовай плошчы заспаны фатограф выпрамляў рэкламны парасон, паўзасыпаны снегам.

Магнітам прыцягваў гмах Ісакіеўскага сабора, Ісакія, як называюць яго ленінградцы. Крок, яшчэ... Я падымаю вочы —?! Замест прывычнай цяжкой каланады — эфірная лёгкасць ліній. Вышэй калон камень перsuccessfully ратварыўся ў іржавую з зялёным адценнем медзь. Сабор стаў зданню. Ісакій — Лятучы галандзец!

Але казка канчаецца, ледзь толькі на адной з калон позірк распазнае вядомую фразу «Тут быў я». Аказваецца, гэта іней, быццам парафінам, абліў змрочныя формы сабора, затушаваў маршчыны ступеняў. Як толькі пацяплее, іней плавіцца, пакідаючы зеленаватыя падцёкі.

* * *

Горад мае многа твараў. Днём ён старажытны, вечарам —малады (сказваецца неонавае убранне рэклам).

На вуліцах, здаецца, адбіліся крокі вялікіх. Вось гэта вуліца чыста пушкінская, гэта — пятроўская, а за каналам — Пецярбург Дастаеўскага. І снег на розных вуліцах здаецца розным — то вільготным, то жорсткім...

* * *

Летні сад у нядзельныя дні ажыўлены. Сцежкі расчышчаны ад снегу, і па іх—гуляюць. Усё таксама ж гуляюць як сто, дзвесце гадоў назад. Малыя збіраюць апалыя за ноч гронкі пладоў клёна. Старыя крышаць хлебны мякіш для птушак. Турысты фатаграфуюць рашотку сада.

Я гляджу на дрэвы Летняга сада. Гэтыя дрэвы ведалі Крылова, Пушкіна... Паголеныя, яны адкрылі людзям усю ажурную вязь ствалоў і бясконцых галін. Гэта мнагарукія божаствы, распрасцёртыя да неба і скаваныя ім. Часам неба яўляе літасць, знімае мароз. Тады па адтаяўшых ствалах коцяцца слёзы ўдзячнасці...

А пакуль дрэвы ў летаргіі. Між імі, як вуллі, стаяць высокія скрыні, дзе захаваны скульптуры сада. Да вясны.

* * *

Ленінградскія масты і мосцікі — карункавыя вейкі іх рашотак упіраюцца ў слупы з абавязковымі фанарыкамі. Вартаўнічыя львы і сфінксы, правіслыя ланцугі асабліва цудоўныя ноччу, калі снег на іх набывае розныя афарбоўкі — то праедзе па мосце адзінокая машына, то бліснe ўпотай вока месяца...

**С. ШЫДЛОЎСКАЯ.**

Фота аўтара.



В. а. рэдактара **В. А. ВОЛЬСКІ.**

НАШ АДРАС

Мінск, універсітэцкі гарадок геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

АТ 04072 Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Заказ № 302.